■ Стыль жыцця

# «МАРУ ЗАХАПІЦЬ СВАІХ ДЗЯЦЕЙ ПАДАРОЖЖАМІ»

**Чалавек — гэта брыльянт, таму ён павінен быць шматгранным. Менавіта такім жыццёвым крэда кіруецца Ганна БЯЛЯК. За свае 24 гады дзяўчына вывучылася на інжынера-праекціроўшчыка метрапалітэнаў, выйшла замуж, з'ездзіла аўтастопам у Польшчу і прайшла турыстычныя інструктарскія курсы. Ганна не можа ўявіць сваё жыццё без яркіх фотаздымкаў, самаробнай выпечкі і танцаў. Калегі дзівяцца з маладзіцы: яна прыязджае на працу на роварах. Хтосьці бавіць вольны час перад тэлевізарам, а Ганна бярэ заплечнік і ідзе па балотах. Але яе самы непрадказальны ўчынак — паход па гарах Цэнтральнай Каталоніі.**

— Усё пачалося з сяброў, якія шмат падарожнічаюць. Яны расказвалі цікавыя гісторыі з вандровак, а я імі захаплялася. Мне заўсёды здавалася, што гэта не для мяне. Лічыла, што трэба валодаць жалезнай сілай волі і неверагоднымі фізічнымі здольнасцямі. Аднойчы знаёмы запрасіў мяне ў паход у Радашковічы. Там я і пазнаёмілася з інструктарам, які праналаваў мне вандроўку ў Іспанію.

Ганну з дзяцінства прыцягвала ўсё новае, нязведанае. Самы лепшы падарунак у жыцці — гэта калекцыя кніг «Я спазнаю свет» ад бацькоў. Найбольш пашарпанымі чамусьці аказаліся кнігі па гісторыі і геаграфіі.

Над прапановай інструктара дзяўчына думала нядоўга. — Сябры дапамаглі мне з каскай, турыстычным заплечнікам, палкамі для хадзьбы, спальнікам, — кажа Ганна. — Я паклала ў заплечнік бутэльку пітной вады, запалкі ў цэлафанавым пакеце (каб не адсырэлі), запасны абутак, шкарпэткі і майкі, аптэчку, ежу. Нават захапіла «451 градус па Фарэнгейце», але мяне хапіла толькі на 15 старонак. Астатняе дачытвала дома. Спадзяюся, Рэй Брэдберы не пакрыўдзіўся. У выніку — 20-кілаграмовы заплечнік! Я прыйшла з працы, запляла свае фірмовыя касічкі, надзела шапку і паехала на вакзал. Там я і сустрэлася з калегамі па паходзе: інструктарам, жанчынай гадоў сарака пяці, хлопцам і дзяўчынай майго ўзросту.

Такі паход па кішэні кожнаму сярэднестатыстычнаму беларусу. Галоўнае — віза, якая абыдзецца прыкладна ў 80 еўра. Большасць сродкаў ідзе на пералёт і правоз багажу. Спаць даводзілася ў палатках.

— Знаёмыя паставіліся да майго падарожжа па-рознаму, — дзеліцца Ганна. — Сяброўкі падзяляюць маё захапленне. Нядаўна яны зрабілі мне цудоўны падарунак — сертыфікат на скаладром. А вось мужа, на жаль, не захапляюць мае інтарэсы. Калі мы браліся шлюбам, я паходамі не цікавілася. Цяпер ён у шоку (усміхаецца). Галоўнае для яго, каб я вярнулася здаровая і без траўмаў. Аднойчы падчас паходу маці даслала мне SMS са словамі «Дачушка, я вельмі ганаруся табою. Я ніколі не адважылася б на такое. Ты малайчына». Гэта былі вельмі прыемныя, натхняльныя словы.

Маршрут быў разлічаны на 12—14 дзён і складаў 120 кіламетраў. Лічба невялікая, але на самой справе ўлічваецца не ўвесь пройдзены кіламетраж, а толькі той, што з нейкімі перашкодамі. Першапачаткова вандроўнікі апынуліся ў Барселоне. «Там растуць мандарынавыя дрэвы! Вось людзі жывуць!» — з захапленнем прыгадвае Ганна. — Я паспрабавала дольку — такая горкая аказалася. Гэта былі дэкаратыўныя мандарыны». Астатнія іспанскія гарады, у якія траплялі падарожнікі, былі вельмі малыя, з вузенькімі вулачкамі і старымі капліцамі. Прайсці іх можна за 10-15 хвілін.

> **Зразумела, што калі магу паўзці па гарах, то ў жыцці магу горы звярнуць.**

На дзіва, з камунікацыяй праблем не ўзнікала. У Барселоне крыху ведалі англійскую мову і некалькі слоў па-руску. «Я ж на іспанскай гаварыла толькі два словы: hola (прывітанне) і gracias (дзякуй). Самая лепшая мова — мова жэстаў. Цікавы выпадак, калі нам з дзяўчынай захацелася паласавацца згушчонкай. Мы бегалі па краме са слоўнікам і дамагліся свайго. У гарах сустракаешся з падарожнікамі з розных куткоў свету. Не ведаючы мовы, мы разумелі адзін аднаго: хтосьці па плячы паляпае, хтосьці руку пацісне. Гэта падбадзёрвала».

— Уразіў характар мясцовых жыхароў. Ты сустракаеш людзей упершыню, але яны адкрытыя, шчырыя. Напрыклад, можна было пакінуць на падзарадцы тэлефоны ў кавярні і пайсці на паўтары гадзіны па сваіх справах. У крамах дазвалялі мыць садавіну. Гэта фантастычны народ.

У гарах надвор'е было непрадказальнае: тэмпература вагалася ад 12 градусаў удзень да мінус 2-3 ноччу, у перадапошні дзень пайшоў лівень, апошні дзень адзначыўся 15-сантыметровым слоем снегу. «Калі быў лівень, мы схаваліся ў прыгарадным муніцыпальным будынку, — распавядае Ганна. — Праз тры гадзіны да нас падышоў нейкі важны дзядзька і паказаў на выхад. Мы спачатку не маглі зразумець адзін аднаго. У выніку ён завёў нас у свой кабінет, адкрыў інтэрнэт і пачаў штосьці друкаваць па-іспанску. «Гугл» пераклаў — «Я мэр горада». Першая думка — што за лухта! Потым мы зразумелі, што знаходзімся ў будынку мэрыі. Калі мэр даведаўся, што мы падарожнічаем па іспанскіх гарах, ён завёў нас да дырэктара турыстычнага клуба. Той арганізаваў нам месцы для адпачынку на мяккіх спартыўных матах, дазволіў пакарыстацца душам і плітой. Ад грошай гаспадары катэгарычна адмовіліся».

На шляху адважных падарожнікаў былі і непрыемнасці, і нечаканыя радасці. Даводзілася лазіць уздоўж бездані па скалах, трываць жудасны боль ад крывавых мазалёў, пакутаваць ад бессані. Здавалася, яшчэ адзін крок — і ты не здолееш ісці. Але калі гэты крок рабіўся, быццам адкрывалася новае дыханне. Ганна ўсё жыццё баялася вышыні. Высветлілася, што гэта не так. Падарожнікі садзіліся на схіл і цешыліся краявідамі.

«У гарах я адчула сябе самым здаровым чалавекам: не балелі ні галава, ні сэрца. Я заўсёды знаходзілася ў руху, таму кроў рэгулярна абнаўлялася.

Дзяўчына заўсёды павінна быць моднай — такім прынцыпам кіравалася Ганна, калі збіралася ў паход. Яна зрабіла манікюр пад колер курткі. Інструктар быў вельмі здзіўлены: «Манікюр у паходзе? Ты адзіная такая на маёй памяці», — пракаментаваў ён. Як камічна гэта ні выглядала на пачатку, Ганна была адзіная, у каго не расслаіліся пазногці.

А яшчэ нашым спадарожнікам давялося есці іспанскія далікатэсы і прымаць душ у экстрэмальных умовах.

— Сухая і мяккая пасцель, чыстая вада, гарачы душ — усё гэта людзі пачынаюць цаніць у паходзе, — упэўнена Ганна. — Аднойчы мы купаліся пры тэмпературы два градусы. Гэтая працэдура суправаджалася віскам і крыкам, але я адчувала сябе ў той дзень духмянай ружай. Галаву памыла за ўвесь час два разы: у прыбіральнях сабора і кафэ. У кавярні ракавіна была ўдвая меншая за маю галаву».

Ежа ў паходзе здаецца ў сто разоў смачнейшай за дамашнюю. У нас было чатыры віды гарніру: аўсянка, грэчка, рыс і іспанская макарона. Гатавалі на газавых балонах. У паходзе я палюбіла малако. У гарах нават батон з чаем і рыбныя кансервы ідуць за мілую душу. Паспелі мы паласавацца і іспанскімі далікатэсамі. Такіх сакавітых апельсінаў я ў жыцці ніколі не каштавала. Здзівілі мяне і іспанскія перцы. Адзін перац разразалі на пяцярых, і кожны атрымліваў велізарны скрыль. А які чароўны смак у хамону (вяленага мяса) і іспанскага марозіва!

Сёння Ганна з усмешкай прыгадвае ўсе неверагодныя выпрабаванні, якія ўдалося пераадолець. Але ні пра што не шкадуе. Яе мара — захапіць сваіх дзяцей падарожжамі і хадзіць у паходы разам з імі. Засталося толькі з мужам дамовіцца. — Паход навучыў мяне з двух велізарных заплечнікаў рабіць адзін, — кажа Ганна. — А калі сур'ёзна, я стала ўпэўненай у сабе. Зразумела, што калі магу паўзці па гарах, то ў жыцці магу горы звярнуць.

Сябар падарыў Ганне на Новы год скрэтч-мапу. На ёй ужо закрэслены Беларусь, Польшча, Расія і Іспанія. Але спыняцца на гэтым дзяўчына не збіраецца. Наадварот — плануе размаляваць яе цалкам.

Застаецца пажадаць Ганне поспехаў у пераадоленні новых маршрутаў. Пасля нашай гутаркі я зразумела яшчэ адну рэч: з такімі адважнымі працаўнікамі трэцяя галіна метро будзе ўведзена своечасова.

**Вераніка УЛАСЕВІЧ**



Ганна караскаецца па цясніне.

■ Выбіраем адпачынак

# СУНІЧНАЕ ЛЕТА... МОЖНА КУПІЦЬ

**Лета — найлепшы час для аздараўлення і адпачынку дзіцяці. Добра, калі вы загадзя паклапаціліся пра тое, як правядзе канікулы ваш сын ці дачка. А калі не... Давайце разам шукаць варыянты дзіцячага адпачынку.**

## ПІКНІКОВЫ

Сітуацыя, калі няма бабуль, дачы і грошай на «марскую» пуцёўку, не тупіковая, упэўнена маладая мама Ірына Ваўчкова. Адпачынак з дзіцем яна праводзіць у горадзе: «Пакуль я была ў дэкрэце, летнія дзянькі мы бавілі ў парках. Малы купаўся ў фантанах, катаўся на атракцыёнах, мы наведвалі гарадскія фестывалі, музеі. Цяпер, калі я выйшла на працу, пікнікі ладзім па вечарах і ў выхадныя. Часам нас падбіраюць знаёмыя: пасля працы яны на машыне выязджаюць за горад — шашлык пасмажыць, пакупацца на возеры, парыбачыць».

## ПАЗНАВАЛЬНЫ

Між іншым, з кожным годам для дзетак, якія вымушаны праводзіць канікулы ў горадзе, розныя камерцыйныя ўстановы прапануюць летнія адукацыйныя паслугі. Школьнікі могуць вывучаць замежныя мовы, праграмаванне, робататэхніку, ладзіць доследы. Разумныя заняткі ёсць нават для малых. Так, летам бацькам 4-6-гадовых дзетак школы ранняга развіцця прапануюць не толькі падрыхтоўку да школы, але і ўрокі малявання, акцёрскага майстэрства і... фізікі, геаграфіі, хіміі, анатоміі — вядома ж, у займальнай форме. Вось толькі часам уражвае кошт асобных прапаноў. Летняя навука для дзяцей у сталіцы можа каштаваць больш, чым адпачынак дзіцяці за такі ж час у аздараўленчым лагеры.

## ПРЫГОДНІЦКІ

Адна справа — вучыцца ў горадзе, іншая — спасцігаць розныя навукі за яго межамі. Так, сёння многія летнікі таксама прапануюць школьнікам розныя пазнавальныя, адукацыйныя праграмы. І спасцігаць на канікулах можна не толькі замежную мову, але і мастацтва, гісторыю, вакал, плаванне, арыентаванне на мясцовасці, скалалазанне, альпінізм. «На лецішчы ў бабулі маёй дачцэ сумна, без сяброў яна там ледзьве вытрымлівае некалькі дзён. А як вяртаецца з летніка — у яе багата расповедаў. Важна толькі адказна падысці да пошуку аздараўленчага лагера, азнаёміцца з тым, якая там база, як падбіраюцца важатыя, што за праграма арганізоўваецца для дзяцей. Шукайце водгукі бацькоў, бо не факт, што ў дарагім летніку, дзе быццам арганізатарамі прадуманы ўсе дробязі, дзіцяці будзе добра», — упэўнена мінчанка Юлія Амельчанка. Сапраўды, сёння можна падабраць для дзяцей цудоўныя месцы адпачынку. У праграме асобных лагераў ёсць экскурсіі, наведванне аквапарка, лазертаг, спартыўныя і інтэлектуальныя спаборніцтвы, майстар-класы, трэнінгі, квесты, падарожжы, сплавы на плытах, катанне на квадрацыклах, катамаранах, рыцарскія турніры. У асобных ствараюцца нават тэматычныя праграмы: напрыклад, хлопчыкі могуць паспрабаваць сябе ў якасці лясных воінаў — яны будуць вучыцца страляць з лука, фехтаваць, засвояць асновы рукапашнага бою і сакрэты выжывання ў лесе.

Ёсць і такія летнікі, для якіх спецыяльна пішацца прыгодніцкі сцэнарый, рыхтуецца рэквізіт, задзейнічаны аніматары. Вось толькі арганізаваныя прыгоды часта каштуюць не менш, чым пуцёўка дзіцяці на мора.

Летнія аздараўленчыя лагеры могуць абысціся ў 2-8 мільёнаў, кошт залежыць ад колькасці дзён, умоў пражывання дзяцей і амбіцый арганізатараў.

Калі ваша дзіця наведвае гурткі ці спартыўныя секцыі, пацікаўцеся, ці не арганізоўваюць клубы і цэнтры дадатковай адукацыі летні адпачынак. Пра яго можна запытацца і ў грамадскіх арганізацыях. Напрыклад, беларускія скаўты кожнае лета збіраюць сваіх сяброў у палатачным лагеры.

## МАРСКІ

Калі бацькі не могуць самі вывезці дзіця на мора — не бяда. Сёння турагенцтвы прапануюць арганізаваны дзіцячы адпачынак на марскіх курортах. Прычым тут для дзяўчатак і хлопчыкаў могуць таксама ладзіцца тэматычныя праграмы. Пляжны адпачынак дзіця можа сумясціць з заняткамі замежнай мовай, тэатральнымі рэпетыцыямі і вывучэннем традыцый пэўнай краіны. Часам арганізаваныя групы дзяцей на мора едуць з педагогамі ад спартыўных і танцавальных клубаў; можаце пацікавіцца, ці магчыма і вам туды ўладкаваць сваіх сыной і дачок.

## СУНІЧНЫ

Добра, калі можна выбрацца на лецішча ў суніцы і іншыя ягады з агарода, лесу. Але не трэба забівацца на гэты варыянт адпачынку, нават калі няма ўласнай дачы. Пры жаданні можна «купіць» сунічнае лета для дзіцяці — зняць дамок. І добра, калі пры ім яшчэ ёсць агародзік і сад, хаця б тыя ж кусты парэчак. Засяліцца можна як у старэнькую вясковую хату, так і ў абсталяваны катэдж — адсюль і вялікая розніца ў цэнах: ад 200 да тысячы (і болей) долараў за месяц.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ**